


# МЫ ГЭТА ЗРАБІЛІ!

**У пераднавагоднія дні выйшла з друку галоўнае тэматычнае выданне 2024 года – зборнік літаратурна-мастацкіх твораў, прысвечаных 80-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў «Памяти вечный огонь». Адметнасць творчага праекта ў тым, што гэта вынік сумеснай працы членаў Саюза пісьменнікаў Беларусі, а таксама аматараў літаратуры і аўтараў-пачаткоўцаў.**

Вось што гаворыцца ў анатацыі да выдання: *«Книга «Памяти вечный огонь» – коллективный труд современных писателей Гродненщины, приуроченный к 80-летию освобождения Беларуси от немецко-фашистских захватчиков. В сборник вошли произведения поэзии, прозы, публицистики о Великой Отечественной войне, Победе, непосредственно освобождении белорусских земель, воспоминания о родных и близких людях – участниках тех памятных событий. Во всех произведениях лейтмотивом звучат память и гордость за непобедимую силу духа народа-освободителя, радость жить и творить под мирным небом».*

Укладальнікі зборніка – Людміла Кебіч і Дзмітрый Радзівончык. Адказныя за выпуск выдання – старшыня Гродзенскага гарадскога савета ветэранаў Аляксандр Радзівонаў і старшыня раённай ветэранскай арганізацыі Кастрычніцкага раёна г. Гродна Уладзімір Цюцюннік. Рэдактары – Л. А. Кебіч і Д. М. Радзівончык. Выдавец – Ніжнік Наталля Пятроўна (Кобрын). Надрукавана ў прыватным выдавецкім прадпрыемстве «ЛітАРы» (Гродна). Ініцыятары праекта – Гродзенскае абласное аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі (старшыня Л. А. Кебіч) і Гродзенскі гарадскі савет ветэранаў (старшыня А. М. Радзівонаў).

Сардэчна дзякуем усім, хто даслаў свае творы, і яшчэ раз публікуем спіс аўтараў, творы якіх уключаны ў выданне: **Уладзімір ЯГОРЫЧАЎ, Вольга АНДРУШЧАНКА, Карына БАТРАКОВА, Ліна БАГДАНАВА, Валянціна БОГУШ, Віктар ВАРАНЕЦ, Галіна ВАСІЛЕЎСКАЯ, Станіслаў ВІШНЕЎСКІ, Ірына ВОЙТКА, Ірына ГАЕВА, Дзмітрый ГЛАВІНСКІ, Святлана ГЛЕМБОЦКАЯ, Ларыса ГАНЧАРОВА, Ціхан ГАНЧАРОЎ, Андрэй ДАРОЖКІН,**

**Яўгенія ДЗЯРКАЧ, Браніслаў ЕРМАШКЕВІЧ, Марына ЕРМАЛОВІЧ, Марына КАНДРАТОВІЧ, Людміла КЕБІЧ, Кацярына КАЛАМІЙЦАВА, Святлана КОШУР, Віктар КУДЛАЧОЎ, Наталля ЛАБЕЕВА, Таццяна ЛУГАВАЯ, Людміла МІЛОСТА, Святлана МЕЛЬНІКАВА-ПІВАВАРАВА, Аляксандр МАРОЗАЎ, Антаніна НУРЭТДЗІНАВА, Наталля ОЗЕРАВА, Вольга АЛІЗАР, Вольга ПЕНЬКОВА, Руслан ПІВАВАРАЎ, Ірына ПОЛУДЗЕНЬ, Дзмітрый РАДЗІВОНЧЫК, Алена РУЖ, Уладзімір РУЛЬ, Алена РУЦКАЯ, Ірына САЛАТА, Ганна СКАРЖЫНСКАЯ-САВІЦКАЯ, Галіна СМОК, Соф'я СУДЗЫНА, Таццяна СУЧКОВА, Аляксандр СЯВЕНКА, Ксенія УРБАНОВІЧ, Галіна УРАДЗІМСКАЯ, Ірына ФАМЯНКОВА, Наталля ЦВІРКО, Валерый ЧАРАПІЦА, Сяргей ЧЫГРЫН, Людміла ШАЎЧЭНКА, Лізавета ШЫМЧУК, Іларыя ШПАКОЎСКАЯ, Таццяна ЭДАРСКАЯ, Таццяна ЯЦУК.**

**!** Паведамляем, што адзін экзэмпляр выдання каштуе 25 рублёў. Кожны, хто пажадае набыць кнігу, можа звязацца з намі па пошце: 230023 г. Гродна вул. Савецкая 31, пак. 39; выслаць паштовым пераводам грашовую суму, якая адпавядае колькасці замоўленых кніг. Кнігі будуць высланы бандэроллю на адрас, пазначаны ў грашовым пераводзе. Кнігі таксама можна набыць у офісе Гродзенскага абласнога аддзялення СПБ пасля 8 студзеня 2025 года па папярэдняй дамоўленасці; тэлефоны: 60-20-22; 29 789 27 95; 29 789 29 61.

**!** Калі ласка, просім не блытаць зборнік літаратурна-мастацкіх твораў, прысвечаных 80-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў «Памяти вечный огонь» з іншай кнігай, якая толькі рыхтуецца да друку і будзе прысвечана 80-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне «Память огненных лет».

Дарагія сябры і калегі! Сардэчна віншуем вас з вынікам нашай агульнай справы – выхадам калектыўнага выдання, прысвечанага 80-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў «Памяти вечный огонь». Расказаць шырокай грамадскасці пра сябе і сваіх герояў, прадставіць уласныя творы ў вас будзе магчымасць падчас прэзентацый кнігі з вашым удзелам. Мерапрыемствы запланаваны на 2025 год. Калі ласка, сачыце за інфармацыяй на нашым сайце і ў сацыяльных сетках.




**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ**

**www.pisateli.by**